СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Горлова, И. И. Этнокультурный брендинг территории как ресурс влияния региональной культурной политики / И. И. Горлова, И. Бычкова, Н. А. Костина // Культурное наследие России. – 2018 – W3. – С. 81 - 86.
2. Известные брестчане [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://gcbs-brest.by/izvestnye-brestchane – Дата доступа: 13.03.2023.
3. Новостной портал БрГТУ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.bstu.by/2023/01/20/20-01-2023-2/?ysclid=lf7729cl4y278401185 – Дата доступа: 13.03.2023.
4. Ремесла предков [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://rlst.org.by/2021/05/21/remyosla-predkov/?ysclid=lfa0js9vv8613276576 – Дата доступа: 13.03.2023.



Бондарук Ю.В., студент 514 группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Гулак А.А.,
кандидат филологических наук, доцент


## ТВОРЧЫЯ ТРАДЫЦЫІ АНСАМБЛЯ НАРОДНАЙ ПЕСНІ «ВІНЕЦ» І ЗАХАВАННЕ ЭТНАПЕСЕННАЙ СПАДЧЫНЫ БЯРОЗАЎШЧЫНЫ

Бярозаўшчына – адметны традыцыямі раён Заходняга Палесся ганарыцца сваімі творчымі калектывамі, якія зберагаюць і папулярызуюць народную культуру, маюць заслужаную любоў мясцовых жыхароў. Адным з такіх калектываў з’яўляецца народны ансамбль народнай песні “Вінец” Равяціцкага СДК Бярозаўскага раёна, творчая біяграфія якога сёння складае 52 гады. Актуальнасць прадстаўленай тэмы абумоўлена неабходнасцю падтрымкі мясцовых творчых калектываў арганізацыйна, у медыйнай і навуковай прасторы. Гэта спрыяе папулярызацыі творчай ініцыятывы,

збераганню ўнікальных мясцовых этнапесенных і сацыяльна-культурных традыцый.

Апачатку адзначым, што мова жыхароў Бярозаўшчыны вызначаецца як заходнепалескі дыялект. Яго асаблівасцю служыць адсутнасць “акання”, наяўнасць цвердых зычных перад [е], [і], пераход /ѐ/ в [і] у націскной пазіцыі, наяўнасць [і] на месцы /о/ і /е/ у закрытым складзе пад націскам, адсутнасць “дзекання” і “цекання” і іншае [1, с. 552]. На сваёй гаворцы размаўляюць многія ўдзельнікі калектыва, на ёй гучаць і песні. Слова *вінец* на заходнепалескім дыялекце абазначае *вянок* або *карона* ў знак ганаровай узнагароды за заслугі.

Творчы калектыў з такой назвай, як ужо адзначалася, узнік і існуе ў аг. Равяцічы Бярозаўскага раёна. Ён – актыўны ўдзельнік многіх культурных мерапрыемстваў, масавых свят і ўрачыстасцей. Гаворачы аб яго станаўленні, адзначым, што ў 1971 г. на базе Равяціцкага сельскага Дома культуры быў створаны хор народнай песні. Хор складаўся з працаўнікоў сельскай гаспадаркі, настаўнікаў, культработнікаў. Першапачатковы склад хору і выбраў назву “Вінец”, якая прыжылася, палюбілася і існуе ў наш час.

Ужо ў 1972 г. калектыў прыняў удзел ў раённым фестывалі самадзейнасці ў г. Бяроза і атрымаў першае месца. З успамінаў К.Ф. Шэшка: “*Былі напружаныя рэпетыцыі, каб праграма была разнастайная, цікавая. Старшыня выдзяляў транспарт і на рэпетыцыі прывозілі спецыялістаў. Прыязджала і харэограф Раіса Андрэеўна Салдатава, перад якой паставілі задачу за кароткі час падтрыхтаваць харэаграфічны нумар. Рэпетыцыі доўжыліся да дзвюх-трох гадзін ночы. Раніцай маладыя настаўнікі спяшаліся на заняткі <…> Вынікам напружаных рэпетыцый і стала наша 1-е месца*” [2].

Відавочна, у творчым плане карысным было культурнае ўзаемадзеянне, якое адбывалася падчас гастрольных паездак паміж спевакамі хору “Вінец” і майстрамі народнай песні з Заходняй Украіны, Расіі, Польшчы. На працягу творчага шляху ў калектыва было шмат выступленняў у Беларусі. Народны

ансамбль народнай песні “Вінец” выступаў на Рэспубліканскім святе-кірмашы “Дажынкі” у Кобрыне (2009) і на абласных “Дажынках” у Маларыце (2010) Бярозе (2011), Пінску (2014), Драгічыне (2016). З’яўляецца пастаянным удзельнікам свят, аглядаў і конкурсаў аматарскай творчасці, сярод якіх раённы агляд-конкурс “Клуб запальвае агні”, раенны культурны праект “Калядныя сустрэчы”, свята культуры і духоўнасці “Свет православия”, раённы праект выхаднога дня “Мелодыі і фарбы лета”, конкурс палескай прыпеўкі “Бярозаўская сербіянка” і іншае.

30 ліпеня 1992 г. хору было прысвоена званне “народны”. У 2008 г. калектыў быў пертвораны ў народны ансамбль народнай песні. У 2021 г. на святкаванні пяцідзесяцігадовага юбілея калектыву першы кіраўнік – Кацярына Фёдараўна Шэшка падсумавала: “*Пяцьдзесят гадоў існуе наш калектыў. Гэта па мерках чалавечага жыцця ўвогуле не шмат, а вось узрост калектыву – гэта вынік творчага пошуку, адзінства душ, поглядаў, можна сказаць – гістарычная вяха*” [2].

На сённяшні дзень у складзе ансамбля 15 удзельнікаў, сярэдні ўзрост якіх складае 33 гады, што гаворыць аб запатрабаванасці творчай традыцыі. Сярод артыстаў працаўнікі КБА, дзіцячага сада, СДК, настаўнікі, механізатары. “*Без песні хоць трэсні!* – любіць паўтараць самая старэйшая удзельніца ансамбля Ларыса Васілеўская. – *Я прыйшла ў калектыў, калі ён яшчэ быў хорам у 2000 г. Стаялі тры лаўкі на сцэне, я спявала на другой. Вось прыйшла і ухадзіць не плануе. А ўдзельнікі ўсё маладзей і маладзей (смяецца). І я разам з імі маладзею. “Вінец” стаў проста часткай мяне, не ўяўляю свае жыццё без песні*” [2]. У калектыве чатыры мужчыны, іх чыстыя ценаровыя і басовыя галасы разам жаночымі сапрана і альтамі утвараюць трох- і чатырохгалосны акорд. Гэта надае агульнаму гучанню паўнату і моц.

Кожную сваю праграму равяціцкія артысты імкнуцца зрабіць асаблівай, каб яна кранала сэрцы гледачоў і таксама падабалася ім самім. Тым больш, што калектыў носіць ганаровае імя сельскагаспадарчага прадпрыемства “Вінец” і з’яўляецца візітоўкай равяціцкага краю і Бярозаўшчыны.

Рэпертуар ансамбля вялікі, ён развіваецца ў народным выканальніцкм стылі. Працуюць як з жывым акампанементам ансамбля народных інструментаў (*баян, балалайка, домра, кантрабас, ударныя, скрыпка*), так і з фанаграмай. Сваімі сіламі апрацоўваюць народныя песні, ствараюць аранжыроўкі. Пры напісанні аранжыровак карыстаюцца прынцыпам ад простага да складанага і ад складанага да простага, з адпаведнасцю выканальніцкім магчымасцям інструментальнай групы. Улічваецца, што песенны фальклор Брэсцкага Палесся, як адзначала знакамітая этнамузыказнаўца З. Я. Мажэйка, характарызуецца глыбокімі традыцыямі харавога і адзіночнага спеву: “Абрадавым мелодыям тут уласціва лаканічнасць, яны выконваюцца ва ўнісонна-гетэрафонным стылі (з элементамі бурданіравання); пазаабрадавыя песні ўсходняй часткі рэгіёна выконваюцца ў шматгалосным стылі, з падводкай” [3, с. 5–6].

Уладзіслаў Міхайлавіч Сярко, які кіруе калектывам з 2017 г., адзначае: ”*Натуральна, лепш успрымаюцца вясёлыя песні, таму ў нас многа жартоўных нумароў. Жыццё зараз перанасычана стрэсамі, таму стараемся адцягнуць увагу гледачоў ад жыццёвых праблем. Ансамбль “Вінец” – не проста калектыў, гэта – вялікая дружная сям’я, дзе кожны можа падзяліцца сваімі праблемамі, працягнуць руку дапамогі, узняць настрой, калі ў кагосьці нешта не ладзіцца*” [5, с. 81]. Да выбару рэпертуару адносяцца старанна. Мясцовы фальклор актыўна выкарыстоўваецца ў рэпертуары калектыва, многія песні гучаць на заходнепалескім дыялекце. Гэта пераважна любоўная і жартоўная лірыка (“*Цвітэ тэрэн, цвітэ тэрэн”,” Половіна сада цвітэ, половіна вянэ”, “Ой маты, мая маты, шось маю казаты”, “А ў городы на прымолоды”, “Ходы, сэстронко, повэчэраймо с тобою”, “Ой у полі крыныца”, “Стаїць гара высокая”, “Голуб сывы”, “Вэснянка”* [4]), у меншай ступені калектыў арыентаваны на сямейна-абрадавую і каляндарна-абрадавую песню.

Захаванне традыцыйнай спадчыны на мясцовым (рэгіянальным) узроўні мае вялікае значэнне, бо з малага складаецца вялікае, з лакальных традыцый – нацыянальнае самадзейнае і прафесійнае мастацтва ў цэлым. Для мясцовых

людзей удзел у мастацкай самадзейнасці – гэта не толькі хобі, але і магчымасць адчуваць сабе часткай калектыву, набыць сілы і веру ў сябе. Спецыфіка народнага спеўнага мастацтва скадаецца ў тым, што яно ўздзельчае на духоўнасць чалавека, яго светапогляд, маральнасць, культуру, чым аказвае станоўчы ўплыў на асобу чалавека. На прыкладзе ансамбля “Вінец” можна назіраць узмацненне сацыяльных і культурных сувязей, што праяўляецца ў творчым узаемадзеянні розных сацыяльных груп у калектыве.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Бирилло, Н. В. Восточнославянские языки. Белорусский язык // Языки мира. Славянские языки: сборник статей / Российская академия наук, Институт языкознания. – М. : Академия, 2005. – 641 с. – С. 548–584.
2. Відэаархіў Равяціцкага СДК. Дыск “Вінец – 50 лет”.
3. Можейко, З. Я. Песни белорусского Полесья [Ноты] : [в 2 вып. : для голоса (хора) без сопровождения] / З. Я. Можейко ; ИМЭФ АН БССР ; [ред. бел. текста М. Я. Гринблата ; предисл. от сост.]. – Вып. 1. М.: Советский композитор, 1983. – 183 с.
4. Рукапісны зборнік народных песень Равяціцкага СДК. – 189 с.
5. Шыманскі, М. М. Вяртанне дародных бяроз: нарысы / Міхаіл Шыманскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. – 303 с. – С. 81.